**Р Э Ц Э Н З І Я**

**Рэцэнзія**
**на дапаможнік А. В. Солахава**
***“Падарожжа ад А да Я”***

## СЛОВАМ АБУДЗІЦЬ ДУМКУ




Поспех навучання, як вядома, у першую чаргу залежыць ад настаўніка, ад яго прафесіяналізму і педагагічнай творчасці. Педагогам-практыкам не трэба тлумачыць, якая гэта няпростая справа – падабраць да ўрока неабходны займальны матэрыял. Не трэба пераконваць і ў тым, што ўмелае яго выкарыстанне на ўроку дазваляе не толькі забяспечыць сістэмнасць і накіраванасць заняткаў, але і павысіць эфектыўнасць навучальна-выхаваўчай работы, стварыць атмасферу пошуку і творчасці. Думаецца, што надзейным дарадчыкам настаўнікаў пачатковых класаў, вучняў, бацькоў стане кніга А. В. Солахава “Падарожжа ад А да Я” (Мінск, “Зорны верасок”, 2012), рэкамендаваная Навукова-метадычнай установай “Нацыянальны інстытут адукацыі”. У дапаможніку сістэматызаваны разнастайныя займальныя заданні і практыкаванні, якія дазваляюць абудзіць думку вучняў, далучыць іх да скарбаў роднага слова.

Адразу трэба адзначыць, што добрае ўражанне пакідае афармленне дапаможніка, асабліва дызайн вокладкі. Кнігу хочацца ўзяць ў рукі, разгледзець яе. Пачынае кнігу прадмова “Ад аўтара”, у якой ён справядліва адзначае, што зрабіць навучанне “цікавым і радасным – запаветная мара кожнага настаўніка” (с. 3). Прызначэнне кнігі “Падарожжа ад А да Я” абумовіла і яе структуру. Займальны матэрыял у дапаможніку згрупаваны вакол літар, размешчаных у алфавітным парадку. У дапаможніку сабраны і сістэматызаваны шматлікія практыкаванні, якія дапамогуць дзецям асэнсаваць моўныя факты, заканамернасці і будуць садзейнічаць выхаванню маўленчай культуры малодшых школьнікаў. Асаблівую каштоўнасць уяўляюць матэрыялы, выкарыстанне якіх будзе спрыяць разумоваму і моўнаму развіццю вучняў. Гэта праца са словамі-хітрунамі, загадкамі-рыфмаванкамі, крыжаванкамі, рэбусамі, складанне слоў-лесвічак, рашэнне заданняў “Граматычнай арыфметыкі”, складанне чарадзейных ланцужкоў, гульні “Канструктар”, “Рассыпанка” і інш. У межах вывучэння кожнага гука і літары матэрыялы дапаможніка згрупаваны ў пяць глаў: “Знаёмства з літарай”, “Засваенне гука”, “Праца са складам”, “Узбагачэнне слоўніка” і “Развіццё маўлення”. Кожная глава змяшчае надзвычай разнастайныя творы (вершы, казкі, лічылкі, загадкі, скорагаворкі і інш.) Р. Барадуліна, В. Віткі, А. Вольскага, М. Танка, В. Зуёнка, Н. Гілевіча, М. Чарняўскага, М. Пазнякова, М. Маляўкі, В. Хомчанкі, П. Пранузы і многіх іншых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў.

У дапаможніку даволі шырока пададзены матэрыялы, падрыхтаваныя заслужаным работнікам адукацыі Рэспублікі Беларусь Н. А. Сторажавай, якія ў апошнія гады актыўна выкарыстоўваюць настаўнікі пачатковых класаў. Шматлікія прыказкі, прымаўкі, гульні, віктарыны, лічылкі, лінгвістычныя пытанні і задачы, змешчаныя у кнізе, дапамогуць вучню разабрацца ў няпростых моўных фактах. Матэрыялы да фанетычных зарадак, чыстагаворкі і скорагаворкі, розныя гульні (“Хто больш?”, “Хто хутчэй?”, “Хто ўважлівы?” і інш.) будуць

МГПУ им. И.П. Шамякина

спрыяць засваенню гука і літары і выхаванню культуры вуснага маўлення. Заданні і практыкаванні, прапанаваныя аўтарам, даюць магчымасць выклікаць цікавасць да роднага слова, абуджаць думку, развіваць фантазію вучня, бо "дзеці, – адзначаў Сухамлінскі, – павінны жыць у свеце прыгажосці, гульні, казкі, музыкі, малюнка, фантазіі, творчасці".

Практычная скіраванасць навучання грамаце і школьнага моўнага пачатковага курса ў цэлым, арыентацыя на развіццё навыкаў маўленчай дзейнасці патрабуюць шматлікіх заданняў, якія дапамагалі б развіваць у дзяцей, як адзначае аўтар, "жаданне думаць, параўноўваць, аналізаваць". У дапаможніку шырока пададзены займальныя заданні ў аналізе і сінтэзе, у групаванні, супастаўленні і абагульненні моўных фактаў. Педагог, здольны да выбару, да самастойнасці, абавязкова знойдзе ў дапаможніку патрэбны займальны матэрыял для азнаямлення вучняў з гукам і для яго засваення, узбагачэння слоўніка вучняў і развіцця маўлення і мыслення.

Шматлікія практыкаванні арыентаваны на развіццё кемлівасці, лагічнага і вобразнага мыслення (займальныя квадраты і мадэлі, шарады, конкурсы канструктараў і інш.). Асноўная задача, якую, відаць, ставіў аўтар дапаможніка – забяспечыць педагога неабходным займальным матэрыялам – дасягнута, бо з дапамогай прапанаваных заданняў настаўнік можа абуджаць і падтрымліваць цікавасць вучняў да слова, пашыраць кругагляд, фарміраваць пазнавальную актыўнасць і творчыя адносіны да роднай мовы. Многія практыкаванні, змешчаныя ў гэтым выданні, ужо апрабіраваны пачатковай школай (былі змешчаны ў дапаможніку "Займальна ад А да Я", Мінск, ТАА "Лексіс", 2004) і знайшлі сваіх прыхільнікаў, аб чым сведчаць выказванні настаўнікаў і студэнтаў-завочнікаў факультэта дашкольнай і пачатковай адукацыі Мазырскага педуніверсітэта імя І. П. Шамякіна.

Станоўчая ацэнка кнігі "Займальна ад А да Я" настаўнікамі-практыкамі дае падставу сцвярджаць, што добры новы дапаможнік атрымалі настаўнікі пачатковых класаў, выхавальнікі дзіцячых устаноў, бацькі і самі дзеці. Няма сумнення, што выкарыстанне прапанаваных аўтарам дапаможніка "Падарожжа ад А да Я" разнастайных займальных матэрыялаў на ўроках навучання грамаце, роднай мовы, на пазакласных занятках дапаможа развіць лагічнае мысленне, кругагляд дзяцей і зрабіць навучанне насычаным, цікавым і жаданым для вучняў.

Рэцэнзент
*Б. А. Крук,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*дэкан факультэта дашкольнай і пачатковай адукацыі*

МГПУ им. И.П.Шамякина